# Батрак Іван
# (1892-1938)



Батрак Іван (Іван Андрэевіч Казлоўскі) — рускі паэт, публіцыст, перакладчык.

Нарадзіўся 17 (29) лютага 1892 ў вёсцы Малое Гальцэва Аршанскага павета Магілёўскай губерні, цяпер Талачынскі раён Віцебскай вобласці ў сям'і беднага селяніна, дзе апроч яго было пяцёра дзяцей. З маленства дапамагаў бацькам, яны, непісьменныя, усё жыццё цяжка працавалі, каб пракарміць сям'ю і лічылі, што жыць трэба з зямлі, але хлопчык хацеў вучыцца. Сваякі дапамаглі Івану паступіць у Коханаўскае двухкласнае вучылішча. Вучоба супала з рэвалюцыяй 1905 года, настаўнікі апавядалі пра рэвалюцыйныя падзеі, чыталі вострасацыяльныя вершы, што моцна ўплыла на школьнае жыццё і наогул лёс Казлоўскага.

У 1908 годзе паступае на 3-ці курс Аршанскага гарадскога вучылішча, у горадзе ўдзельнічае ў сходках і маёўках рабочых, уцягваецца ў рэвалюцыйнаю дзейнасць. Скончыць вучылішча не ўдалося, Казлоўскі быў выключаны за карыкатуру на настаўніка. Іван вяртаецца ў Малое Гальцэва, але самаадукацыі не кідае.

У 1911 годзе паехаў у Пецярбург. Працаваў на многіх работах, пакуль не ўладкаваўся на сталую працу ў чыгуначныя майстэрні. Наведваў рабочы гурток пры Лігаўскім народным доме і таварыства “Навука і веды”. Спрабаваў чытаць лекцыі і пісаць вершы. Першыя вершы апублікаваў у газеце “Правда” ў 1913 годзе. Удзельнік літаратурнага гуртка паэта А.І. Машырава-Самабытніка.

З 1914 года член РСДРП(б) (Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі). Падчас 1-й Сусветнай вайны арганізаваў у Пецярбургу падпольную бальшавіцкую друкарню, удзельнічаў у выданні нелегальнага часопісу “Рабочий голос”, газеты “Пролетарский голос”. У 1915 годзе за ўдзел у рэвалюцыйным руху арыштаваны, асуджаны да 8 гадоў катаргі. Правёў 2 гады ў зняволенні ў Шлісельбургскай крэпасці. Вызвалены падчас Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года, вярнуўся да рэвалюцыйнай дзейнасці, удзельнічаў у VII-й красавіцкай Усерасійскай канферэнцыі РСДРП(б).

Са снежня 1917 года прызначаны сакратаром Аршанскага павятовага камітэта РКП(б) і прыехаў у Оршу. Адначасова быў адказным рэдактарам газеты “Известия Совета рабочих, крестьянских, батрацких и красноармейских депутатов Оршанского уезда”, якая выходзіла з мая 1917 года, а з 5 кастрычніка 1918 года была перайменавана ў “Набат”. Казлоўскі не толькі рэдагуе, але і сам піша артыкулы на грамадска-палітычныя тэмы, пра надзённыя праблемы горада.

У 1920 годзе пераведзены ў Растоў-на-Доне. З 1921 года ў Маскве, працаваў у газетах “Беднота”, “Правда”, часопісе “Комбайн”, членам рэдкалегіі часопіса “Земля Советская”. Скончыў факультэт грамадскіх навук Маскоўскага ўніверсітэта (1924г.). Адзін з кіраўнікоў Усесаюзнага таварыства сялянскіх пісьменнікаў, 10 чэрвеня 1924 года абраны адказным сакратаром гэтай арганізацыі. У 1930-я гады — член Саюза савецкіх пісьменнікаў.

Арыштаваны 31.01.1938 года ў Маскве па адрасе праезд Мастацкага тэатра, д. 2, кв. 16.

Асуджаны 21.04.1938 года за “ўдзел у контррэвалюцыйнай тэрарыстычнай арганізацыі” да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 21.04.1938 года ў Маскве (на “Камунарцы”). Па звестках Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР рэабілітаваны 24.03.1956 года, але месца пахавання з-за даўнасцю часу аднавіць немагчыма.

Іван Батрак пісаў на рускай мове. Аўтар зборнікаў баек і вершаў. Перакладаў на рускую мову творы Я. Коласа і К. Крапівы, іншых беларускіх і ўкраінскіх паэтаў. На беларускую мову творы І. Батрака перакладалі Э. Валасевіч і У. Паўлаў.

Памёр 21 красавіка 1938 года.

## Дадатковы матэрыял аб жыцці і дзейнасці Івана Батрака:


1. **Батрак (сапр. Казлоўскі) Іван Андрэевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1996. — Т. 2. — С. 350.
2. **Каралёў, Г.** Імя земляка / Грыгорый Каралёў // Віцебскі рабочы. — 1967. — 22 красавіка.
3. **Карниловіч, Э.** Пісьменнікі майго раёна / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013. — 7, 10 жніўня, 4, 11, 18 верасня. — С. 3; С. 5; С. 7; С. 7; С. 7.
4. **Корнилович, Э.А.** Большевистский поэт / Эдуард Корнилович // На гребне истории. — Минск, 1989. — С. 188–198.
5. **Корнилович, Э., Мехтиев, А.** Таланты щедрой земли / Эдуард Корнилович, Александр Мехтиев // Наша Талачыншчына, 2011. — 25 чэрвеня; 29 чэрвеня; 2 ліпеня. — С. 6; с. 7.
6. **Симонович, Д.** Средь торжествующего зла... / Давид Симанович // Подорожная Александра Пушкина. — Минск, 1977. — С. 81–92.
7. **Стукалава, В.Л.** Іван Батрак – рэдактар і паэт / Вольга Стукалава // Аршанскі краязнаўчы зборнік. — 1997. — №2. — С. 62–64.


## Інтэрнэт-рэсурсы:


1. **Іван Батрак** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Іван_Батрак. — Дата доступу : 21.10.2022.
2. **Погибшие поэты** — жертвы коммунистических репрессий : [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://vcisch2.narod.ru/index.html. — Дата доступа : 21.10.2022.
3. **Фундаментальная электронная библиотека** : [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://feb-web.ru/feb/kle/kle-abc/ke9/ke9-1071.htm. — Дата доступа : 21.10.2022.